✓На вялікі жаль, гісторыя была бязлітаснай да беларускай культуры, і да нашага часу не захавалася многіх артэфактаў мінуўшчыны. Аднаму з іх прысвечаная выстава **«Узноўлены шэдэўр»**, што адкрылася **30 сакавіка** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Цяпер не засталося амаль ніводнай арыгінальнай дошкі, з якой нашы продкі рабілі цудоўныя гравюры ў XVI – XVIII стст. На выставе ўпершыню, дзякуючы вядомаму бібліяфілу, калекцыянеру гравюраў і экслібрысаў Алегу Судлянкову, дэманструецца ўнікальная гравіравальная дошка XVII ст. і ўзноўленая з яе паводле даўняй тэхналогіі гравюра з партрэтам караля і вялікага князя Яна III Сабескага.

Прадстаўленая медная дошка XVII ст. выкананая ў тэхніцы разцовай гравюры. Гэта адна з найбольш старажытных тэхнік гравіравання на метале, за якой на беларускіх землях замацавалася назва медзярыт. На жаль, сучасныя айчынныя майстры ўжо не працуюць у тэхніцы разцовай гравюры на метале. Аднак да нашых часоў захаваліся дасканалыя беларускія медзярыты, уключаныя ў склад старадрукаў XVII – XVIII стст., найлепшыя таксама прадстаўленыя на выставе.

Тэхналогія і друк гравюры паўтораныя мастаком-графікам Віктарам Саўчанкам і прадстаўленыя на выставе ў фармаце відэафільма.

Выстава будзе працаваць у музеі да 30 траўня.